*З мэтай адраджэння культу сям'і, дапамогі прыёмным сем'ям, узмацнення іх пазіцый і аўтарытэту ў грамадстве аўтарамі вышэйздзенага артыкула **В. У. Чэчатам** і **Л. І. Смагінай** распрацаваны праект Палажэння аб Асацыяцыі прыёмных сямей Беларускага дзіцячага фонду, які мы прапануем сёння ўвазе чытачоў. Спадзяёмся, што атрымаем карысныя заўвагі і прапановы.*

# Палажэнне

## аб Асацыяцыі прыёмных сямей Беларускага дзіцячага фонду

Асацыяцыя прыёмных сямей Беларускага дзіцячага фонду — самастойная грамадская арганізацыя. Яна аб'ядноўвае на добраахвотнай аснове сем'і, што ўсынавілі, узялі пад апеку і выхоўваюць дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў. У сваёй дзейнасці Асацыяцыя кіруецца заканадаўствам Рэспублікі Беларусь і Канвенцыяй аб правах дзіцяці, якая прынята 20 лістапада 1989 г. Генеральнай Асамблеяй Аб'яднаных Нацый. Асацыяцыя з'яўляецца юрыдычнай асобай з усімі правамі і абавязкамі, мае сваю пячатку і рахунак у банку.

Дзейнасць Асацыяцыі забяспечваецца матэрыяльнай і прававой абаронай Беларускага дзіцячага фонду. Асацыяцыя падтрымлівае яго прынцыпы і задачы, садзейнічае рабоце органаў апекі па ўладкаванні ў сем'і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў.

### Мэты і задачы Асацыяцыі

Асноўная мэта Асацыяцыі — адраджэнне культу сям'і як найбольш спрыяльнага і натуральнага асяроддзя для выхавання ўсіх яе членаў, асабліва дзяцей, устанаўленне прыярытэту сямейнага выхавання.

### Асноўныя задачы:

садзейнічанне развіццю разнастайных форм выхавання ўсіх дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без бацькоўскай апекі, незалежна ад іх разумовага і фізічнага стану;

забеспячэнне маральнай, сацыяльна-эканамічнай і прававой абароны прыёмных сямей;

вывучэнне, абагульненне і распаўсюджанне станоўчага вопыту работы дзіцячых дамоў сямейнага тыпу як адной з найбольш гуманных форм выхавання і грамадска-дзяржаўнага клопату аб дзецях-сіротах і дзецях, якія засталіся без апекі бацькоў;



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

забеспячэнне прававой і медыцынскай падрыхтоўкі бацькоў-выхавацеляў, удасканаленне іх псіхолага-педагагічнага майстэрства праз розныя формы навучання, аказанне дапамогі ў канфліктных і іншых экстрэмальных сітуацыях;

развіццё прамых кантактаў паміж прыёмнымі сем'ямі як на тэрыторыі рэспублікі, так і за яе межамі.

## Арганізацыйная структура Асацыяцыі

Членам Асацыяцыі можа стаць любая сям'я, якая ўсынавіла, узяла пад апеку ці выхоўвае прыёмных дзяцей, незалежна ад іх колькасці. Акрамя таго, у Асацыяцыю могуць быць прыняты грамадзяне Рэспублікі Беларусь ці іншых краін, сем'і, дзяржаўныя і грамадскія арганізацыі, установы, прадпрыемствы і кааператывы, якія аказваюць матэрыяльную падтрымку непасрэдна прыёмным сем'ям Асацыяцыі, садзейнічаюць вырашэнню яе задач.

Асобы, якія прымаюцца ў Асацыяцыю на аснове заявы, атрымліваюць пасведчанне, плоцяць уступны ўзнос і штогадовыя членскія ўзносы ў размерах, якія ўстаноўлены праўленнем. Ім выдаецца членскі білет.

Вышэйшым органам упраўлення Асацыяцыі з'яўляецца рэспубліканская канферэнцыя, якая склікаецца не радзей аднаго раза ў 2 гады. Рашэнні канферэнцыі прымаюцца агульнай большасцю галасоў.

Для рэалізацыі прынятых канферэнцыяй рашэнняў і рэкамендацый выбіраецца праўленне, колькасны склад якога вызначаецца на канферэнцыі. Адначасова выбіраюцца старшыня праўлення і першы сакратар.

Праўленне зацвярджае сакратара па арганізацыйных пытаннях і склад камісій, якія могуць вырашаць наступныя праблемы:

інфармацыі і прапаганды;

псіхолага-педагагічнай, медыцынскай і юрыдычнай дапамогі бацькам-выхавацелям;

забеспячэння камунікацыйнай дзейнасці Асацыяцыі;

вывучэння станоўчага вопыту выхавання прыёмных дзяцей з мэтай яго далейшага распаўсюджання.

Праўленне збіраецца па меры неабходнасці, але не радзей аднаго раза ў квартал. Яно з'яўляецца калегіяльным выканаўчым і распарадчым органам, які кіруе бягучай работай Асацыяцыі на аснове дадзенага Палажэння і падсправаздачна канферэнцыі.

Грашовы фонд Асацыяцыі складаюць членскія ўзносы і паступленні спонсараў. Правільнасць і мэтазгоднасць расходавання сродкаў зацвярджаецца рашэннем канферэнцыі.

---

*In the article by V.Chechet and L.Smagina results of summuring the experience of the Belarus Children's Houses(family type) and Draft of Status on adopted Families Association with the Belarus Children Fund are given.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ